# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

5 лютага 2004 года, чацвер, № 2 (1887)


ВІНШУЕМ!

## Кафедры тэарэтычнай фізікі — 65 гадоў

*Урачыстае пасяджэнне кафедры тэарэтычнай фізікі з нагоды 65-годдзя ад часу яе заснавання і 50-годдзя абароны першай доктарскай дысертацыі па тэарэтычнай фізіцы ў Беларусі адбылося 3 лютага ў Габеленавай зале рэктарата нашага ўніверсітэта.*

Кафедра была заснаваная ў 1938 г. з ініцыятывы Фёдара Іванавіча Фёдарава, сына вядомага пісьменніка Янкі Маўра, фізіка-тэарэтыка, доктара фізіка-матэматычных навук, акадэміка Акадэміі навук Беларусі, Героя сацыялістычнай працы, лаўрэата дзяржаўных прэмій СССР і БССР. Ф.І. Фёдараў узначальваў кафедру на працягу 25 гадоў, працаваў тут да апошняга дня жыцця.

Праца кафедры шмат у чым вызначыла развіццё тэарэтычнай фізікі ў Беларусі: тут падрыхтавана больш за 80 кандыдатаў навук, больш за 20 з іх — прадстаўнікі замежных дзяржаваў. Сярод выпускнікоў кафедры членыкарэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.А. Богуш і Л.М. Тамільчык, дырэктар Нацыянальнага навукова-навучальнага цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій М.М. Шумейка, прарэктар міжгаліновага Інстытута павышэння кваліфікацыі па новых кірунках тэхнікі і тэхналогій М.С. Пятроў, загадчык лабараторыі нелінейнай акустыкі Масачусетскага тэхналагічнага інстытута (ЗША) Л.Т. Перальман. Рэктар нашага універсітэта прафесар В.І. Стражаў таксама з'яўляецца выпускніком кафедры.

Сёння на кафедры працуюць 6 дактароў і 7 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук. Штогод выпускнікамі кафедры становяцца 6—8 фізікаў-тэарэтыкаў. Супрацоўнікі кафедры маюць шчыльныя кантакты як з універсітэтамі Беларусі, так і з ВНУ Масквы, Санкт-Пецярбурга, Львова, Новасібірска, навуковымі цэнтрамі Германіі, Фінляндыі, Швейцарыі. Выкладчыкі кафедры ўдзельнічаюць у правядзенні сумесных даследаванняў з навукоўцамі Йенскага універсітэта (Германія) і супрацоўнікамі кафедры тэарэтычнай фізікі Вільнюскага універсітэта (Літва). Сярод прафесараў кафедры ёсць члены Нью-Йоркскай акадэміі навук, Амерыканскага аптычнага таварыства, карэспандэнты Міжнароднага радыёфізічнага саюза URSI.

Тэматыка навуковых даследаванняў супрацоўнікаў кафедры тэарэтычнай фізікі ахоплівае многія раздзелы сучаснай оптыкі, акустыкі, радыёфізікі, квантавай фізікі, фізікі элементарных часціц і высокіх энергій, гравітацыі, астрафізікі і касмалогіі. У сярэднім супрацоўнікі кафедры разам са студэнтамі і аспірантамі публікуюць у год каля 50 навуковых артыкулаў у вядучых навуковых часопісах свету.

На ўрачыстым пасяджэнні прысутнічалі вядучыя фізікі-тэарэтыкі краіны, акадэмікі Нацыянальнай акадэміі навук, дырэктары акадэмічных інстытутаў, вядомыя выпускнікі кафедры.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ*
*Фотаздымкі Аляксандра СНАПКА*

**Ад рэдакцыі:** У бліжэйшых нумарах «Беларускага універсітэта» чытайце інтэрв'ю з загадчыкам кафедры тэарэтычнай фізікі прафесарам Леанідам Матвеевічам Баркоўскім.









На вашым факультэце адбываецца штосьці цікавае? Праходзіць канферэнцыя ці семінар? Конкурсы і вечарыны? Адбылася сустрэча з цікавым чалавекам? Вы хочаце выказаць сваю думку па нейкай праблеме, падзяліцца сваімі ідэямі і адкрыццямі? Пішыце ў **"Беларускі універсітэт"** — і ўвесь БДУ будзе ведаць пра вас.

**Напішам летапіс alma mater разам!**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Інтарэсы факультэта — на спартыўную пляцоўку!

Прыемныя хваляванні ад Нараджэння Хрыстова і Новага года ў супрацоўнікаў нашага універсітэта супалі з навіной пра магчымасць паўдзельнічаць у спартакіядзе "Здароўе", якая была наладжана 31 студзеня і 1 лютага. Спартакіяда юбілейная, прысвечаная 60-годдзю вызвалення Беларусі і 100-годдзю прафсаюзнага руху ў нашай краіне. Супрацоўнікі спярша паставіліся да ідэі скептычна. Але змяніла іх настрой адказнае стаўленне да спартакіяды старшыні спартыўна-масавай камісіі прафкама Заслужанага дзеяча фізічнай культуры, ветэрана спорту, удзельніка і арганізатара многіх рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтваў В.Ф. Кавалёва.

Пры падрыхтоўцы юбілейнай спартакіяды "Здароўе" быў выкарыстаны досвед правядзення аналагічных мерапрыемстваў яшчэ 70—80-х гадоў мінулага стагоддзя. Старэйшыя супрацоўнікі універсітэта згадваюць тыя часы: пакуль студэнты здавалі іспыты на сесіі, выкладчыкі адстойвалі спартыўныя інтарэсы сваіх падраздзяленняў на спартыўных пляцоўках. На жаль, потым стаўленне да спартакіядаў стала больш халодным. Зрэшты, энтузіясты засталіся, і іх дзейнасць дае свой плён. У іх ліку можна назваць А.П. Кузнечыка, А.Ф. Навумовіча (ММФ), І.С. Манака (ФРФіЭ), А.П. Буцько (фізічны факультэт), Д.М. Саковіча (фізічны факультэт), У.А. Цітка (гістарычны факультэт). Гэты пералік можна было б доўжыць.

У сцэнарый правядзення юбілейнай спартакіяды ўвайшлі не толькі спартыўныя спаборніцтвы. Упрыгожаннем мерапрыемства стаў удзел фальклорнага ансамбля "Тутэйшай шляхта" (кіраўнік А. Махнач).

Урачыстае адкрыццё фіналу спартакіяды адбывалася ў актавай зале спартыўнага комплекса "Брыганціна". Рэктар універсітэта В.І. Стражаў, старшыня прафсаюзнага камітэта Я.П. Туромша пажадалі ўдзельнікам прадэманстраваць не толькі пэўны ўзровень спартыўных дасягненняў. Асаблівую ўвагу яны звярнулі на ўмацаванне здароўя, неабходнасць правесці спаборніцтвы без траўмаў. А словы В.І. Стражава пра рашэнне рэктарата і прафкама зрабіць спартакіяду з выездам на спортбазу рэгулярнай, удзельнікі сустрэлі апладысментамі.

Спаборніцтвы адбываліся па шахматах (15 камандаў), баскетболе (6 камандаў), настольным тэнісе (12 камандаў), валейболе (8 камандаў), міні-футболе (8 камандаў), армрэстлінгу (9 камандаў) і плаванні (14 камандаў). Усяго за першынство змагаліся 15 камандаў розных універсітэцкіх падраздзяленняў. Удзел у спаборніцтве прынялі больш за 200 супрацоўнікаў БДУ.

Пасля двухдзённых спаборніцтваў агульнакаманднае **першае месца заняў калектыў кафедры фізвыхавання і спорту.** Ва ўрачыстай абстаноўцы капітану каманды старшыні прафбюро В.М. Юшко быў уручаны пераходны кубак.

**Другое месца заняла каманда факультэта радыёфізікі і электронікі,** пры камлектаванні якой арганізатарскія здольнасці



выявіў Д. Ушакоў. **Спартсмены ваеннага факультэта** (капітан каманды — падпалкоўнік М.М. Слабейка) не прынялі ўдзел толькі ў адным відзе спартакіяды. Гэта пасунула каманду **на трэцяе месца.**

Астатнія месцы размеркаваліся наступным чынам:

**4-е** — зборная студгарадка;
**5-е** — зборная фізічнага факультэта;
**6-е** — зборная геаграфічнага факультэта;
**7-е** — зборная юрыдычнага каледжа;
**8-е** — зборная НДІ ФХП;
**9-е** — зборная УП "Унікаштмет";
**10-е** — зборная хімічнага факультэта;
**11-е** — зборная юрыдычнага факультэта;
**12-е** — зборная механіка-матэматычнага факультэта;
**13-е** — зборная ФПМІ;
**14-е** — зборная гістарычнага факультэта;
**15-е** — зборная выдавецкага цэнтра.

Два дні спаборніцтваў прамінулі хутка. За арганізацыю і падрыхтоўку спартыўнай базы, размяшчэнне і харчаванне ўдзельнікаў спартакіяды дырэктар У.А. Палякоў і яго намеснікі П.С. Яцыновіч, М.І. Маркечка заслужылі словы падзякі і каштоўныя прызы.

*М.Ф. КУЗЬМЯНКОЎ,*
*дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту*
*Фотаздымкі Яўгена ПАМЫТКІНА*





СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Лектар з Нідэрландаў

*Курс лекцый па міжнародным бізнесе прачытаў у БДУ Тон Стэкеленбург — прадстаўнік універсітэта Fontys з Нідэрландаў. Ён прыбыў у Мінск у адпаведнасці з Дагаворам аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і навукі, які падпісалі эканамічны факультэт БДУ і Школа маркетынгу-менеджменту універсітэта Fontys у верасні 2003 г.*

Універсітэт Fontys, які знаходзіцца ў Эйнховене — горадзе-пабрацімe Мінска, мае даўнія традыцыі ў развіцці электроннага бізнесу, і галандскія спецыялісты гатовыя падзяліцца досведам у гэтай справе. Паводле словаў Т. Стэкеленбурга, беларускія тавары — якасныя і недарагія, але мала вядомыя ў Еўропе. Выправіць гэтую сітуацыю можна пры дапамозе эканамічнай інфарматыкі, маркетынгу і менеджменту. Выдатнай базай для міжнароднага гандлю, на думку сп. Стэкеленбурга, можа стаць электронная тавараправадная сетка, створаная Нацыянальным цэнтрам маркетынгу і кан'юнктуры цэнаў пры Міністэрстве замежных справаў. Але намаганняў адной арганізацыі недастаткова, адукаваныя спецыялісты ў галіне маркетынгу павінны быць на кожным прадпрыемстве.

Гэтай жа думкі прытрымліваецца і дэкан эканамічнага факультэта прафесар, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі Міхаіл Кавалёў: ён кажа, што асноўная частка беларускай прадукцыі — экспартаарыентаваная. Нягледзячы на вялікую колькасць аддзяленняў і факультэта міжнародных адносін, у краіне няма спецыялістаў, якія б валодалі майстэрствам міжнароднага продажу. Існуе вострая патрэба ў прафесіяналах для працы на таварных рынках ва ўмовах глабальнай эканомікі і жорсткай канкурэнцыі.

Менавіта таму ў БДУ ўпершыню ў краіне было адкрыта аддзяленне міжнароднага менеджменту, дзе выкладаецца не тэорыя сусветнай эканомікі, а практыка вядзення міжнароднага бізнесу. Студэнты вывучаюць структуру таварных рынкаў і сучасныя тэхналогіі стварэння тавараправадных сетак, новыя схемы міжнароднай лагістыкі продажу. Павысіць кваліфікацыю тут могуць і дыпламаваныя спецыялісты. Асаблівай папулярнасцю ў кіраўнікоў айчынных прадпрыемстваў карыстаецца магістратура, дзе за 2 гады навучання яны асвойваюць новыя тэхналогіі і метады продажу на міжнародных рынках.

Паколькі Галандыя традыцыйна лічыцца лідэрам у вядзенні міжнароднага бізнесу, у БДУ вырашылі павучыцца досведу гэтай краіны. Бестэрміновы дагавор прадугледжвае інфармацыйны абмен у сферы адукацыі і навукі, стажыроўку выкладчыкаў і вытворчую практыку студэнтаў. Адна з асноўных мэтаў супрацоўніцтва — развіццё сумеснага бізнес-праекта.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

ДЗЕНЬ НАВУКІ

# Вядучая роля ў адукацыі і навуцы

Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту належыць вядучая роля ў адукацыйным працэсе краіны і навуковай дзейнасці. Пра гэта заявіў першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук на пасяджэнні вучонага савета БДУ, прысвечаным Дню беларускай навукі. Паводле словаў А. Жука, з 740 заданняў дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, якія рэалізуюцца сёння, 329 выконваюць навукоўцы галоўнай навучальнай установы Беларусі. Пры гэтым, па 19 праграмах універсітэт з'яўляецца галаўным выканаўцам.

БДУ добра ведаюць і за мяжой: супрацоўнікі універсітэта і падведамасных яму арганізацый выконваюць навукова-тэхнічныя даследаванні па 70 кантрактах з прадпрыемствамі і кампаніямі бліжняга і далёкага замежжа. Агульны аб'ём фінансавання гэтых работ складае больш за 1,2 млн долараў, падкрэсліў А. Жук.

Як зазначыў рэктар БДУ Васіль Стражаў, трывалы інтэлектуальны задзел ствараўся ў ВНУ яшчэ ў савецкі час. Сёння ж перад краінай, і БДУ ў прыватнасці, стаіць задача не толькі захаваць, але і павялічыць гэты патэнцыял. Таму навуковым даследаванням і падрыхтоўцы маладых навукоўцаў у БДУ надаецца першаступеннае значэнне: 80 % аспірантаў універсітэта абараняюць дысертацыі з першага раза.

КАНФЕРЭНЦЫІ

## Еўропа ў старажытнасці

Навукова-практычная канферэнцыя "Усходняя Еўропа ў старажытнасці і сярэдневяччы" прайшла ў студзені на гістарычным факультэце БДУ. На навуковым форуме абмяркоўваліся пытанні побыту і вераванняў старажытных насельнікаў Усходняй Еўропы, унікальныя скарбы і археалагічныя знаходкі, зробленыя ў 2002—2003 г. Удзел у канферэнцыі прынялі спецыялісты з гістарычнага факультэта БДУ, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, навукоўцы з Польшчы і Расіі.

## Антыкрызіснае кіраванне

Праблемы дзяржаўнага антыкрызіснага кіравання і павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі разглядаліся на II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая адбылася ў БДУ 27—28 студзеня. Спецыялісты Беларусі, Казахстана, Латвіі, Польшчы, Расіі, Узбекістана, Украіны абмеркавалі прававыя аспекты рэструктурызацыі і банкруцтва прадпрыемстваў, праблемы дыягностыкі і рэйтынгу банкаў. Увага надавалася таксама кіраванню фінансавымі плынямі, антыкрызісным працэсам у прамысловасці, банкаўскай сферы, аграсектары. У мерапрыемстве прынялі ўдзел спецыялісты Дэпартамента па санацыі і банкруцтве Мінэканомікі, прадстаўнікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

# Новы прыбор працей за гадзіннік

Створаны арыгінальны прыбор для кантролю цэзію-137 у жывых жывёл і ў іх тушах на мясакамбінатах. Яго можна выкарыстоўваць на фермах жывёлагадоўчых гаспадарак і нават на ўласных падворках. Ва ўсякім разе, яго распрацоўшчыкі, вучоныя Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага універсітэта імя А.Д. Сахарава сумесна з калегамі НДУ "Інстытут ядзерных праблем" БДУ пастараліся, каб ён быў нескладаны і просты ў прымяненні.

Цэзій-137 — радыеактыўны ізатоп, які, трапляючы ў жывы арганізм, у тым ліку чалавечы, назапашваецца ў мышачных тканках і падчас распаду разбурае біялагічныя клеткі. У навакольнае асяроддзе ён траліў спачатку ў выніку выпрабаванняў атамнай зброі, але большасць яго аказалася там у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Перыяд яго вывядзення з жывога арганізма — прыкладна два месяцы. Цэзій выводзіцца з арганізма жывёлы яшчэ пры яе жыцці, калі карміць тую чыстымі харчамі. Дзякуючы новаму прыбору з'яўляецца магчымасць дабіцца, каб забруджанае мяса не трапіла на стол чалавека, тым больш што пры дапамозе гэтага прыстасавання можна вызначыць і ўзровень забруджанасці кармоў.

Новыя якасці прыбор для кантролю цэзію-137 атрымаў дзякуючы выкарыстанню мадуляцыйнай методыкі, распрацаванай у НДУ "Інстытут ядзерных праблем" БДУ. Нягледзячы на тое, што гэта пераносны прыбор непасрэднага вымярэння без адбору проб, мадуляцыйная методыка дазваляе вымяраць удзельную актыўнасць цэзію-137 у тканках жывёл у любых рэальных фонавых умовах з дакладнасцю стацыянарнага радыёметра. Прычым забруджанасць ці незабруджанасць тэрыторыі слаба паўплывае на гэтую дакладнасць. Што вельмі дарэчы, калі ўлічыць, што ў нашай краіне збіраюцца прыняць расійскія нормы ўтрымання цэзію ў ялавічыне: замест 500 Бк/кг — 160 Бк/кг.

Як расказаў нам адзін з аўтараў распрацоўкі, загадчык кафедры радыеэкалогіі універсітэта імя Сахарава, кандыдат тэхнічных навук Міхаіл Антонавіч Батурыцкі, нядаўна прыбор для вымярэння цэзію прайшоў выпрабаванні на Гомельскім мясакамбінаце, дзе ўдала зарэкамендаваў сябе як на канвеернай лініі, так і пры кантролі жывых жывёл "на ўваходзе". Наперадзе яго чакае доследная эксплуатацыя на мясакамбінаце ў Калінкавічах. І калі ўсё і надалей будзе добра — прамысловы выпуск, які можа быць арганізаваны на базе НДУ "Інстытут ядзерных праблем" БДУ.

Мэта распрацоўшчыкаў — зрабіць гэты прыбор бліжэй да чалавека, які жыве на забруджанай тэрыторыі. Тым больш, што ім можа карыстацца кожны, хто ўмее выставіць час на сваім электронным гадзінніку. Бо прыбор працейшы ў карыстанні нават за той гадзіннік. У кожным райцэнтры ёсць лабараторыя, якая можа памераць не толькі цэзій-137, але і стронцый-90. Аднак людзі туды ходзяць рэдка, нават тыя, хто жыве блізка. З новым прыборам можна прыйсці да чалавека дадому і высветліць узровень радыеактыўнай забруджанасці яго жывёлы непасрэдна дома. Па словах М.А. Батурыцкага, вопыт студэнцкай радыелагічнай практыкі паказвае, што людзі зацікаўлены ў вымярэннях сваіх сядзібаў, жылых дамоў, хлявоў і нават скляпоў, а таксама жывёлы, малака, бульбы, гародніны, яблыкаў і г. д.

*Ганна ЛАГУН*

ПРАЕКТЫ

# У навуцы — разам

*У Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі будуць створаныя філіялы базавых кафедраў БДУ.* Сфера ўзаемадзеяння НАН Беларусі і БДУ — хімічныя і біёлага-хімічныя тэхналогіі, даследаванні ў сферы аграрных навук і сумежных галінаў — аграэканомікі і сяльгасмашынабудавання. Для гэтага плануецца стварыць сумесны Цэнтр калектыўнага карыстання.

Старшыня ВАКа Анатоль Рубінаў адзначыў неабходнасць таго, каб тэматыка дысертацыйных даследаванняў адпавядала прыярытэтам навукова-тэхнічнай палітыкі, а старшыня Камітэта па навуцы і тэхналогіях Юрый Плескачэўскі падкрэсліў, што перавага ў фінансаванні будзе аддавацца аграрнаму кірунку.

Каардынаваць пытанні ўзаемадзеяння НАН Беларусі і БДУ будзе сумесны вучоны савет.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

АБ'ЯВЫ

**"ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:*

лабараторыя ядзернай оптыкі

старшы навуковы супрацоўнік — 1 чалавек.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г.Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл.226-42-31.**

У ПРАФКАМЕ СТУДЭНТАЎ

# Прафгрупоргі вучацца ў дыялогу

У рэалізацыі планаў і задач любой прафсаюзнай арганізацыі значную ролю адыгрываюць прафсаюзныя актывісты. У студэнцкім асяроддзі БДУ гэта студэнты, вакол якіх групуюцца шараговыя члены прафсаюза. Каб лідэры гэтых факультэцкіх груп эфектыўна і плённа здзяйснялі сувязь у вертыкалі "студэнт — прафкам", патрабуюцца рэгулярныя сустрэчы прафсаюзнага актыву і кіраўніцтва прафсаюзнай арганізацыі. Асаблівую ўвагу ў прафкаме студэнтаў БДУ надаюць вучобе прафгрупоргаў І курса. Для гэтага арганізуецца спецыяльнае мерапрыемства, якое праводзіцца ўжо не першы год — злёт прафгрупоргаў. Як лічаць у прафкаме студэнтаў БДУ, мэтазгодна праводзіць гэта мерапрыемства праз некалькі месяцаў пасля пачатку лекцыйных курсаў у студэнтаў. Да гэтага моманту дакладна высвятляюцца тыя праблемы і пытанні, якія найбольш хвалююць універсітэцкую моладзь, прафгрупоргі назапашваюць нейкі вопыт у зносінах з аднагрупнікамі, ведаюць амаль усе тэмы, што закранаюць інтарэсы студэнтаў. Таму можна сказаць, што злёт прафгрупоргаў БДУ, які адбыўся 4 снежня — з'ява не дужа дзіўная.

Вучоба на злёце была арганізавана інтэрактыўным спосабам: спачатку перад студэнтамі выступіла старшыня прафкама студэнтаў БДУ Ніна Радзевіч. Яна акрэсліла асноўныя сацыяльныя пазіцыі студэнцкага прафкама, раскрыла змест дзейнасці арганізацыі. Потым студэнтаў падзялілі на групы, і кожнай групе далі пытанні наконт таго, што і як хочуць змяніць у прафкаме студэнтаў яго маладыя прафсаюзныя актывісты, як можа кожны асобны студэнт уплываць на змены ў прафсаюзе да лепшага, чаму пэўны працэнт студэнтаў захоўвае пасіўнасць у адносінах да прафсаюза і г.д. Пасля пэўнага часу, адведзенага на апытанне, праводзілася агульнае абмеркаванне яго вынікаў. У дыялогу выразна акрэсліваліся шляхі, па якіх пажадана было б карэктаваць дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ, палепшыць структуру і змест яе дзейнасці.

На думку студэнтаў, якія прысутнічалі на мерапрыемстве, было б добра, калі б прафкам студэнтаў БДУ меў свае спартыўныя пляцоўкі, каб часцей праводзіліся студэнцкія спаборніцтвы. Яны звярнулі ўвагу прафкама на праблемы маладых студэнцкіх сем'яў, а таксама пажадалі заахвочваць студэнтаў да ўступлення ў прафсаюз не толькі размеркаваннем пуцёвак у санаторый-прафілакторый, але і цікавымі праектамі, якія б дазвалялі кожнаму раскрыць сваю індывідуальнасць. Да таго ж, студэнты адзначалі неабходнасць палепшыць структуру інфармавання шараговых членаў прафсаюза. Для гэтага, дарэчы, сёлета ў студзені—лютым прафкам студэнтаў плануе правесці конкурс сярод факультэтаў БДУ на лепшую пастаноўку інфармацыйнай работы.

*Лілія САВІЦКАЯ,*
*прэс-цэнтр пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ*

СВЯТЫ

# Ліцэй БДУ адзначыў дзень нараджэння

*Тры дні — з 29 па 31 студзеня Ліцэй БДУ адзначаў свой дзень нараджэння: сёлета яму 14. За час святкавання будынак Ліцэя наведалі больш за 1000 гасцей.*

Урачыстае адкрыццё, як заўсёды, даверылі дырэктару — Генадзю Уладзіміравічу Пальчыку. А потым пачалося сапраўднае свята: квінтэт ліцэістак, закаханых у выкладчыкаў, хлопцы ў берэтах МНС і выкладчык фізкультуры, які танчыць разам з імі. А яшчэ каля 20 нумароў шоу-балета "Тодэс", "Фабрыкі зорак" усіх выпускаў і з усімі рэгаліямі, "Еўрабачання—2004". Апладзіравалі ўсе стоячы. Выкладчыкі нават праспявалі хорам з ліцэістамі. А велізарнага святочнага торта ўсё адно аказалася мала. Але свята толькі пачыналася...

Ліцэйская спартакіяда, якая адбылася 30 студзеня, сабрала 3 каманды — 10-х, 11-х класаў і выкладчыкаў. Талісманам імправізаваных "Алімпійскіх гульняў" стала малпачка "Чы-Чы", ролю якой пагадзіўся адыграць загадчык гаспадаркі. Першае месца занялі 10-класнікі, ганаровае другое месца заняла каманда выкладчыкаў. 11-ыя класы занялі 3-е месца, але іх гэта не асабліва хвалявала: яны рыхтаваліся да вечара выпускнікоў. На гэтай вечарыне стала ясна, што таленты ліцэістаў амаль не саступаюць талентам прызнаных "зорак". "Еўрабачанне" можна было правесці без выезду ў Турцыю.

У апошні дзень святкавання, 31 студзеня, прайшла X навукова-практычная канферэнцыя "Першы крок у навуку". Падчас працы секцый гісторыі (грамадскіх навук), біялогіі, геаграфіі, замежных моў, матэматыкі, інфарматыкі, хіміі, фізікі і інш. было абмеркавана больш за 80 работ. Больш за 30 навукова-даследчых работ ліцэістаў былі адзначаны дыпломамі на пленарным пасяджэнні канферэнцыі.

Сумна ўсведамляць, што застаўся ззаду яшчэ адзін ліцэйскі год, што скончылася святкаванне, што на стале чакаюць падручнікі. Але ж гэта не апошні дзень нараджэння ліцэя. Праз год яму будзе 15!

*Мікалай БРЭДЗЕЛЕЎ,*
*ліцэіст 11-га класа*



ВЫСТАВЫ

# Каменная казка

*Чарговая міжнародная мінералагічная выстава-кірмаш "Каменная казка", прысвечаная 70-годдзю Музея землязнаўства геаграфічнага факультэта, пройдзе 11—15 лютага.*

Выстава будзе працаваць з 11.00 да 20.00 у актавай зале галоўнага корпуса. Штодня з 14.00 да 16.00 наведвальнікаў выставы будуць чакаць сустрэчы з універсітэцкімі творчымі калектывамі: ансамблем "Тутэйшая шляхта", дзіцячым танцавальным ансамблем "Літарынка". Прадугледжваецца таксама дэманстрацыя слайд-фільма "Таямнічы свет самацветаў" Музея землязнаўства, будзе працаваць навучальная экспрэс-гемалагічная лабараторыя, наведвальнікі атрымаюць кансультацыі спецыялістаў, змогуць набыць адпаведную навуковую і навукова-папулярную літаратуру.

Падчас працы выставы ў музеі будзе экспанавацца калекцыя "Палеанталагічнае лета — 2003", сабраная супрацоўнікамі і студэнтамі геаграфічнага факультэта, а таксама выстава драўляных скульптураў "Абуджаны ў пакуце дух" выкладчыка кафедры дынамічнай геалогіі Данілы Тварановіча-Сеўрука.

На ўрачыстае адкрыццё, якое адбудзецца 10 лютага ў 13.00, запрошаны беларускія альпіністы І.Ф. Герасімовіч і Л.С. Галубоўскі, якія ўзыходзілі на гару Арарат: яны падарылі музею горную пароду з гэтай вяршыні.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# Цуд на Каляды

Увесь снежань з ініцыятывы студэнтаў і супрацоўнікаў кафедры сацыяльнай работы Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ праводзілася дабрачынная акцыя "Калядная казка". Больш за 30 дзяцей-інвалідаў і маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія жывуць у Партызанскім раёне сталіцы, атрымалі на Новы год святочныя падарункі.

Ідэя арганізаваць акцыю знайшла гарачую падтрымку ў адміністрацыі інстытута. Студэнты малявалі плакаты, дзе прасілі адгукнуцца кожнага, хто спачувае чужой бядзе. На працягу месяца студэнты і выкладчыкі інстытута прыносілі прысмакі, садавіну, цацкі, алоўкі, альбомы для малявання і іншыя падарункі. У многія арганізацыі Мінска былі дасланы лісты з рэкламнымі буклетамі. Знайшліся людзі, не абыякавыя да дзіцячага болю, адгукнуліся і прынялі ўдзел у дабрачыннай акцыі. Сярод іх былі універмаг "Беларусь", Мінскі холадакамбінат, грамадскае аб'яднанне "Міжнародны фонд "Клопат пра дзяцей". Дапамагла ўдзельнікам акцыі старшыня Асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам Партызанскага раёна Мінска Вера Саўт.

Уручэнне падарункаў адбылося на ранішніку ў актавай зале сярэдняй школы № 69. Студэнты кафедры сацыяльнай работы прынялі актыўны ўдзел у гэтым мерапрыемстве: яны віншавалі дзяцей, танчылі з імі, вадзілі святочны карагод вакол ялінкі і дарылі дзецям, а таксама іх бацькам святочны настрой.

Дзеці весяліліся, елі цукеркі, кожны сыходзіў дадому, трымаючы ў руках пакет з прысмакамі і цацку. А бацькі шчыра дзякавалі ўсім, хто зрабіў іх дзяцей шчаслівымі ў той дзень.

*Л.М. ЛЕСІЎ-ІВАНОВА,*
*Н.М. КРАСОЎСКАЯ,*
*Н.П. РАМАШЭЎСКАЯ,*
*выкладчыкі кафедры сацыяльнай работы Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

5 лютага 2004 года, чацвер, № 2 (1887)

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

# Творчы канцэрт ад БДУ

У канцы лютага — на пачатку сакавіка БДУ збіраецца ўразіць аматараў забаваў сваёй канцэртнай праграмай. Менавіта ў гэтыя дні будзе адзначацца 75-годдзе мастацкай самадзейнасці універсітэта. Мяркуецца, што канцэрт пройдзе або ў Тэатры музычнай камедыі, або ў КЗ "Мінск", дзе ўсе творчыя калектывы нашага універсітэта пакажуць сваю новую праграму. Цікавасць да мерапрыемства павінна ўразіць, калі прыняць да ўвагі, што амаль усе калектывы носяць званне народных. Сярод іх найстарэйшыя — ансамбль танца "Крыжачок", аркестр народных інструментаў, харавая капэла, тэатр-студыя "На балконе". А таксама хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў "Родніца", фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш", музычны тэатр-студыя "На філфаку", фальклорны ансамбль "Тутэйшая шляхта" і дзіцячы ўзорны ансамбль танца "Літарынка", якія ўзніклі пазней, аднак таксама ўжо паспелі сябе зарэкамендаваць. Плануецца, што на мерапрыемстве выступяць і госці. А іх будзе шмат — нават з-за мяжы, куды творчыя калектывы БДУ ездзілі са сваімі выступленнямі.

Мастацкі кіраўнік упраўлення па справах культуры Інэса Корчак, якая вось ужо семнаццаць гадоў клапоціцца аб развіцці мастацкай самадзейнасці ва універсітэце, гаворыць, што ніводная ВНУ краіны не можа пахваліцца такой колькасцю творчых калектываў, тым больш народных. Апошнім часам у БДУ з'явілася шмат новых сучасных калектываў: студыя эстраднай песні, шоу-балет "Шчаслівая сямёрка", вакальныя групы "ФЭНСІ" і "Вокс", фольк-мадэрн-мюзікл "ФЭСТ", клуб аўтарскай песні і г. д.

Арганізатары мерапрыемства спадзяюцца, што яно не толькі прынясе задавальненне наведвальнікам, але і далучыць да мастацкай самадзейнасці БДУ новых студэнтаў, якія на сённяшні дзень толькі пачынаюць знаёміцца з творчымі калектывамі універсітэта.

*Ганна ЛАГУН*



У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Да новых сустрэч, Мялешкі!

## *(калядная вандроўка "Родніцы")*

Хутка праімчаліся святочныя дні, і жыццё паступова ўваходзіць у сваю звыклую працоўную каляіну. Але яшчэ доўга будзе помніцца хвалюючая атмасфера навагодніх і калядных дзён, поўная рамантычнай узнёсласці. Колькі было выступленняў, канцэртаў, творчых сустрэч у гэтыя святочныя дні! Пра адну такую сустрэчу народнага хора "Родніца" Беларускага дзяржаўнага універсітэта з жыхарамі вёскі Мялешкі Слуцкага раёна мне і хочацца расказаць чытачам газеты.

Цудоўным калядным ранкам мы выехалі з Мінска. Зімовыя пейзажы абапал дарогі зачаравалі сваёй казачнай прыгажосцю. Часам здавалася, што вось-вось выйдзе з лесу Дзед Мароз са сваёй Снягуркай...

Вёска Мялешкі сустрэла нас цішынёй і адчуваннем уладкаванасці і ўпарадкаванасці жыцця. Ці трэба гаварыць, якая атмасфера цеплыні і шчырай прыязнасці панавала ў зале мясцовага клуба! Першая частка канцэрта была цалкам прысвечана Калядам: былі і песні, і скокі, і жартаўлівыя пажаданні, і велічальныя спевы ў гонар гаспадара — Анатоля Іванавіча Дулі, старшыні СПК імя Калініна. Энергічны, падцягнуты, з густам апрануты, ён адразу ўразіў нашых жанчын сваёй спрытнасцю і адкрытасцю, бо вагання прыняўшы запрашэнне патанчыць на сцэне разам з самадзейнымі артыстамі. З прыватнай размовы, ужо пасля канцэрта, мы даведаліся, што Анатоль Іванавіч з'яўляецца кіраўніком гаспадаркі ўжо 18 гадоў. З цеплынёй гаварыў старшыня пра сваю гаспадарку, спецыялістаў, якія ў ёй працуюць.

У другой частцы канцэрта прагучалі вядомыя беларускія, украінскія і рускія народныя песні. Многія з іх спяваліся ў апрацоўцы кіраўніка хора Уладзіміра Кузьміча Зяневіча. Як прыемна было, калі зала падтрымлівала нас, спяваючы разам з намі і "Шумяць вербы", і "Ехаў Ясь на кані", і "Кавалёк". Асаблівую ўвагу прыцягнулі да сябе салісты хора Людміла Навумовіч і Віктар Ахраменка, якія выканалі вядомую беларускую народную песню "Тры крынічанькі". Заслужаныя апладысменты прагучалі ў адрас нашага канцэртмайстара Танечкі Улога, якая вельмі задушэўна праспявала беларускую народную песню "Мамонька-галубонька".



Не перабольшваючы, хачу сказаць, што "Родніца" ў нейкім сэнсе унікальны самадзейны хор народнай песні ў краіне. У гэтым годзе ён адзначыць сваё 25-годдзе. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, калектыў выстаяў, не распаўся і працягвае сваю канцэртную дзейнасць. У складзе хора выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта. Ёсць сярод нас дацэнты матэматыкі і філолагі, географы і біёлагі, выкладчыкі фізікі, хіміі і замежных моў, загадчыца аспірантуры і загадчыкі лабараторый, лабаранты. І ўсіх нас аб'ядноўвае шчырая любоў да роднай песні.

Нельга не ўзгадаць пра адзін, на мой погляд, вельмі важны аспект дзейнасці "Родніцы" — своеасаблівую працу па прафесійнай арыентацыі моладзі, якую хор праводзіць падчас сваіх канцэртаў. Звычайна зайсёды пасля выступленняў удзельнікі хора адказваюць на шматлікія пытанні, звязаныя з паступленнем і вучобай у БДУ, які з'яўляецца адной з прэстыжных ВНУ у нашай краіне. Так было і на гэты раз: са сваімі пытаннямі да нас падыходзілі вучні, выкладчыкі і дырэктар мясцовай школы Людміла Мікалаеўна Бараноўская, якая прыемна ўразіла нас чысцінёй беларускай мовы. Дарэчы, наш універсітэт закончыла нямала вучняў мясцовай школы, што сведчыць пра высокі ўзровень настаўніцкіх кадраў, неабходныя ўмовы навучання, якія, думаецца, створаны не без дапамогі кіраўніка памянёнага СПК. Анатоль Іванавіч, як сапраўдны гаспадар, не мог адпусціць гасцей без пачастунка. Доўга будуць помніцца цёплыя словы, выказаныя ў адрас хора і, канечне, смачныя стравы, прыгатаваныя шэф-поварам мясцовай сталоўкі Наталляй Ягораўнай Чашавай.

Мы развіталіся з гасцінным гаспадаром, жыхарамі вёскі Мялешкі, выказваючы апошнія словы-пажаданні: "Бывайце, Мялешкі! Да новых сустрэч! Жадаем вам шчасця, долі ды гасцей паболей!"

*Людміла ХРЫШЧАНОВІЧ*

ДЛЯ ЦЯБЕ

# Дзень святога Валянціна

*Набліжаецца свята кахання і закаханых — Дзень святога Валянціна. 14 лютага нехта ўпершыню, а хтосьці ў чарговы раз прызнаецца ў каханні. Мы прапануем вам сёння некаторыя звесткі з гісторыі і геаграфіі свята, а таксама "пераклад з мовы кветак" для самых сціплых.*

## Першая "валянцінка"

"Валянцінкамі" называюць віншавальныя паштоўкі ў выглядзе сардэчак са шчырымі пажаданнямі, прызнаннямі ў каханні, прапановамі рукі і сэрца альбо проста жартамі. Стваральнікам першай "валянцінкі" легенда прыпісвае французу — Карлу, герцагу Арлеанскаму. У 1415 г. ён сядзеў у адзіночнай камеры турмы і выршыў змагацца з нудой, пішучы любоўныя пасланні ўласнай жонцы.

Найбольшага росквіту "валянцінкі" дасягнулі ў XVIII ст. Сёння апрача паштовак-"валянцінак" каханым дараць ружы (кветкі кахання), цукеркі ў выглядзе сардэчак і іншыя прадметы з выявай сэрцаў, Амура, птушак, якія зліліся ў пацалунку.

## Дзе як

У Англіі яшчэ з сярэднявечча захаваўся звычай выбіраць "Валянціну". Хлопцы цягнуць з капелюша запіскі з імёнамі дзяўчат. Выбраная гэткім чынам дзяўчына станавілася на цэлы год "Валянцінай". Праўда, клопаты з такой пачэснай пасадай былі не ў яе, а кавалера: ён мусіў складаць для сваёй дзяўчыны вершы, спяваць песні, дарыць кветкі, паўсюдна суправаджаць яе. Дзяўчына ж мусіла змірыцца з тым, што цэлы год ёй трэба бачыць аднаго і таго ж хлопца. Акрамя таго, брытанцы любяць пасылаць "валянцінкі" не толькі людзям, але і сваім хатнім гадаванцам.

Італьянскія закаханыя дараць адзін аднаму на гэтае свята шакаладныя цукеркі, унутры якіх схаваныя запіскі з прызнаннямі ў каханні. Пакласці іх туды — цяжка, але радасць каханага чалавека вартая такіх намаганняў.

Немцы дагэтуль лічаць святога Валянціна апекуном душэўнахворых (ад лац. valeo — быць здаровым). Таму 14 лютага ўсе лякарні Германіі ўпрыгожваюцца пунсовымі стужкамі, а ў капліцах ладзяць адмысловыя службы.

Палякі перакананыя, што мошчы святога Валянціна захоўваюцца ў адным з касцёлаў Познані. Там ёсць і абраз святога: у правай руцэ ён трымае меч, а ў левай — кубак. Лічыцца, што для ўдачы ў каханні трэба абавязкова пабачыць гэты абраз.

У Японіі 14 лютага адбываецца спаборніцтва ў самым гучным прызнанні ў каханні. Ад воклічаў "Я цябе кахаю!" проста страсаюцца вуліцы Токіо і іншых японскіх гарадоў. А яшчэ японцы лічаць Дзень святога Валянціна своеасаблівым "мужчынскім святам": падарункі атрымліваюць пераважна прадстаўнікі моцнага полу.

## Мова кветак

**Чырвоная ружа** — сімвал кахання, таямніцы, цішыні. Паводле індыйскай легенды, самая прыгожая жанчына ў свеце — Лакшмі нарадзілася з раскрыцця бутона ружы.

**Архідэя** прысвячаецца багіні кахання і прыгажосці. За сваю прыгажосць і унікальнасць яе называюць арыстакраткай сярод кветак.

**Ландыш** спрадвеку асацыяваўся з пяшчотай, вернасцю, каханнем і самымі высокімі пачуццямі.

**Лілеі** старажытныя грэкі прыпісвалі боскае паходжанне і лічылі яе сімвалам надзеі. Апрача таго, лілею шанавалі і як сімвал міру.

**Незабудка** — сімвал памяці, сяброўства, вечнага кахання, вернасці.

**Піён** у Кітаі сімвалізуе дабрабыт і каханне. А ў Японіі гэтая кветка азначае сарамяжлівасць.

**Цюльпан** увасабляе радасць і шчасце.

**Эдэльвейс** заваёўвае сэрцы самых недаступных прыгажуняў: як доказ адданага кахання юнакі прыносяць дзяўчатам высакагорныя эдэльвейсы.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*5 лютага 2004 года*

*Падпісана да друку 04.02.2004*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 131. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

Рэдактар Т.М. КАЗАК

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by*